**Урбан, В. В.** Дыялог / В. В. Урбан // Культура Беларусі : энцыклапедыя. Т. 3. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2012. – С. 560.

**ДЫЯЛО́Г** (ад гр. dialogos – гутарка, размова), функцыянальная разнавіднасць маўлення, якая рэалізуецца ў працэсе зносін паміж субяседнікамі і складаецца з паслядоўнага чаргавання рэплік дзвюх або некалькіх асоб. Характэрнымі асаблівасцямі Д. з’яўляюцца: непадрыхтаванасць (спантаннасць) маўлення, сітуацыйная (залежнасць ад умоў і абставін камунікацыі) і кантэкстуальная (залежнасць ад папярэдняй рэплікі) абумоўленасць. Як форма маўлення Д. характарызуецца вялікай колькасцю пытальных, клічных і няпоўных (у тым ліку і эліптычных) сказаў, зваротаў, выклічнікаў, паўтораў. У вусным Д. шырока выкарыстоўваюцца інтанацыйныя магчымасці мовы, а таксама невербальныя сродкі – міміка, жэсты.

– Дзед, а ў цябе пчолкі ёсць?
– Ёсць. Купіў калоду.
– Ой, дзед, я прыеду на лета к табе і буду карміць іх!
– А як ты будзеш карміць?
– А я буду наліваць у талерачкі малако і насіць ставіць на домікі.
(А. Жук. «Паляванне на Апошняга Жураўля»).

Часцей за ўсё Д. складаецца з асобных рэплік (выказванняў субяседнікаў) – рэплік-стымулаў і рэплік-рэакцый. Рэплікі-стымулы могуць выражаць зварот да асобы, паведамленне, пытанне, пабуджэнне, а рэплікі-рэакцыі – адказ, сустрэчнае пытанне, пярэчанне, удакладненне і інш. У бытавых дыялогах часта выкарыстоўваюцца рэплікі-клішэ: *Як здароўе? Што чуваць? Што новага? Да заўтра! Шчасліва! Пабачымся! Няма сумнення! Дамовіліся!*

Дыялагічная форма маўлення з’яўляецца асноўнай формай рэалізацыі гутарковага стылю (бытавы дыялог), характэрна для мастацкай літаратуры (дыялогі персанажаў), публіцыстыкі (інтэрв’ю, дыскусія), афіцыйна-дзелавой сферы (субяседаванне, перамовы).

У пісьмовым маўленні ў Д. могуць уключацца словы аўтара.

– Ты чаму села там? – спытаў ён.
– Цябе баюся, – гарэзліва адказала Саша.
– А я цябе і там пацалую.
(І. Шамякін. «Трывожнае шчасце»).

*Літ.*: Беларуская мова: энцыклапедыя. Мінск, 1994; М.Я. Цікоцкі. Стылістыка беларускай мовы, 1995.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ